В подобных условиях в одной лишь Москве жило свыше 170 тыс. человек! Крайне низкий уровень жизни, нищета, безграмотность, болезни, отсутствие всяких прав -- таково это было "великое государство". О чем, к примеру, говорит факт, что дети с 7-9 лет начинали трудиться на сортировке руды, работали погонщиками лошадей, светильщиками, а с 14 лет -- в горячих цехах? О том, что в "великом государстве" деспоты с младенчества формировали рабскую философию у людей труда.

Не большевики, как Вы утверждаете, "разрушили в 1917 г. Российскую государственность". Так называемая государственность, основанная на насилии, рухнула сама. Ибо не выдержали те самые "национальные окраины", где люди гибли от голода и болезней, не выдержал и сам русский народ роль отведенного ему "господина-деспота".

Было разрушено не территориальное единство, а территориальное принуждение, угнетение воли народов. Царизм всячески подавлял все требования о национально-культурных автономиях.

Тогда, в 1917 г. взорвалась система насилия. Большевикам удалось остановить процессы децентрализации, сохранить государство почти в старых границах.

Вы помните, что писал о Полесье в середине прошлого столетия исследователь И.Столпянский? Он писал о курных, будто слепленных из каменного угля, низких, покосившихся, вросших в землю домах, более походивших на жилье термитов, а не человека. Он писал, что люди здесь, "лишенные всякого сообщения, живут как дикие".

Стоит ли жалеть о таком государстве?

Ваш тезис о том, что границы ни одной республики в СССР не совпадали с этническими, не выдерживает серьезной критики. Возьмите любой атлас и в разделе "Народы" Вы обнаружите поразительное совпадение территориальных границ с этническими.

А теперь остановимся на вопросе об Учредительном собрании, о котором Вы пишете, что большевики "попрали волю народов", разогнав его. Напомню, что оно было разогнано после того, как, лишившись кворума, продолжило работу. Имело ли смысл оставлять эту "учредилку", все решения которой не имели бы юридической силы? С другой стороны, проанализировав документы, принятые Учредительным собранием без кворума, можно прийти к выводу, что судьба "единого и неделимого государства Российского" была предрешена, ибо собрание провозгласило демократическую республику с признанием национального суверенитета входивших в Россию народов. Так что, кто бы ни оказался у власти, а сохранить кровавый режим все равно бы не удалось.

Система общественных отношений (и прежде всего в межнациональном плане) отнюдь не была навязана, а развивалась исторически. Большевикам удалось создать такую страну, где "национального вопроса" практически не существовало.

И все-таки права Нина Шелдышева -- Вы не поняли сути Октября 1917 г. Что дает Вам право утверждать, что большевики были "контрабандно импортированы из-за границы"? Неужели импортировали все 400 тыс. человек (а именно столько состояло в партии большевиков в сентябре 1917-го)? Всем известно, что большевики были одной из ветвей российской социал-демократии, причем они были наиболее крепки в своих взглядах и последовательны.

То, что действительно "импортировали (контрабандно) в запламбированных вагонах", -- так это нынешних демократов буржуазного пошиба. Ибо что еще можно сказать о людях, которые прямо заявляли о своем желании развалить союзное госсударство. Все негативные процессы, происходящие на территории бывшего СССР -- это следствие разрыва интернациональных связей. А виновны в этом так называемые "демократы".

Сергей МУДРОВ,
ученик 10 кл.
г.Барановичи.

ВЕЛИКУЮ ПОБЕДУ НЕ ЗАМАРАТЬ!

Нельзя без чувства гордости и радости вспоминать июльские дни 44-го. Шли наши войска! Шли с востока на запад! Пехотинцы в выгоревших гимнастерках, покрытые пылью, уставшие, но со спокойными и добрыми в бронзовом загаре лицами. Проходили отряды кавалеристов. Двигалась военная техника. Во всем чувствовалась уверенность, мощь. Какое было ликование!

Но вот через день или два, к большой неожиданности для всех, в этом же направлении вдруг начали идти...немцы. Это продолжалось несколько часов. Они шли по дорогам, тропами, прямо через поля, без техники. Шли тяжело -- мрачные, подавленные, с опущенными головами, и уже в сущности мало походили на армию. Это, вероятно, были из тех, кому удалось вырваться из окружения -- то ли из минского, то ли из бобруйского "котлов".

В те же июльские дни, после завершения операции "Багратион", по указанию Сталина несколько десятков тысяч немецких военнопленных были проведены под конвоем в Москве. Уникальные кадры фотохроники! Медленно движущаяся бесконечная колонна во главе с офицерами и генералами в оцеплении наших солдат... Неповторимое зрелище! И тоже нельзя без чувства радости и гордости смотреть за наших доблестных, героических воинов, за наш народ. И, конечно же, приятно сознавать, что эти вражеские войска, некогда сильные, наглые и кичливые, а сейчас смиренно бредущие, взяты в плен на белорусской земле.

И нельзя без горечи и боли наблюдать сегодняшнюю действительность. Сознание отказывается воспринимать то, что происходит. Могло ли тогда, почти полвека назад, придти кому-нибудь в голову подобное! Народ-победитель, народ-герой испытывает крайнюю нужду, ему, словно нищему, шлют жалкие подачки с Запада, в том числе и те, которых он победил...

Почему так произошло? Что случилось? В чем причина этого позора? -- такими вопросами задается сегодня едва ли не каждый человек нашего еще недавно единого и могучего государства.

А причина одна: совершенный в 1991 г. с помощью Запада кучкой предателей и изменников государственный переворот, приход к власти антисовецких, антисоциалистических режимов, их упорное стремление возродить капиталистический строй. Великая Держава по живому разорвана на части. Проводимая политика привела к развалу экономики, к разгулу спекуляции и преступности, к обнищанию людей. Те, кто отстоял нашу свободу, кто обеспечил Победу в 45-ом, по существу оказались в нищете.

Антинародные режимы с помощью находящихся у них на службе прессы и телевидения обливают грязью все наше прошлое, шельмуют нашу героическую историю. И делается это последовательно, целенаправленно, с привлечением популярных имен. К великому сожалению, и в нашей республике часть интеллигенции по сути дела предала интересы своего народа, переметнулась на сторону новых властей, стала защищать их политику, "обосновывать" ее правильность. Для этого используются понятия независимости, поощряются откровенные националистические амбиции. Чего стоят разглагольствования на сей счет, к примеру, таких "демократов", как писатель Василь Быков или поэт Нил Гилевич? Уж кому-кому, а им должно быть хорошо известно, что подлинную государственность, развитие науки, национальной культуры и искусства белорусы получили только при Советской власти.

Или чего стоит политика лидеров БНФ во главе со "спадаром" Позняком -- политика нескрываемой антирусской направленности?

Победа в 45-ом была обеспечена благодаря дружбе и сплоченности народов страны, благодаря героизму и самоотверженности советских людей, их патриотизму, хорошо понимавших, что они защищают свое социалистическое Отечество, защищают свой образ жизни, свои идеалы. Сейчас нынешние власти всячески стараются вытравить из памяти народной эту великую Правду.

Участники сговора в Беловежской пуще Ельцин, Кравчук и Шушкевич, ликвидировавшие Советский Союз, совершили тягчайшее преступление. И опять же сердце наполняется болью; ведь это тоже произошло на белорусской земле! В тайне от людей, вопреки всесоюзному референдуму сделали черное дело и поспешили доложить президенту заморской страны! Результаты этого преступления уже видны: кровь, огонь, страдания. Сколько жертв, сколько искалеченных судеб! И находятся люди -- ученые, писатели, генералы, которые поддерживают этих "деятелей". Рано или поздно, но ответственность за содеянное придется нести.

Благополучие белорусского народа, выход из тяжелейшего кризиса видятся в единственном -- в недопущении капитализации, в восстановлении связей с братскими республиками, в восстановлении нашего единого государства.

Мы в очередной раз празднуем освобождение Белоруссии, в очередной раз отдаем должное героизму и мужеству советских воинов-освободителей. Сегодня им тяжело, как никогда. Сегодня в почете иная публика -- изменники и вражеские прислужники, перевертыши, очернители, холуи... Сейчас другие порядки, другие принципы, другие символы... но простые люди, настоящие патриоты никогда не смирятся с этими порядками, никогда не согласятся с превращением республики в сырьевой придаток Запада, никогда не изменят отношения к русскому народу.

"ДА" красному знамени с серпом и молотом -- знамени Освобождения и флагу Победы! "НЕТ" флагу полицаев-предателей, под которым совершались преступления против белорусского народа! "НЕТ" новоявленным буржуа!

Великую Победу не замарать!

Антон ЗМИТРОВИЧ.

РАЗВІТАЛЬНАЕ СЛОВА СЯБРУ



З даўняй пары я добра ведаў цябе, Вялянцін Цімафеевіч, як актыўнага, добрага пісьменніка, смелага і вострага публіцыста,чый талент выразна праявіўся, як у шматлікіх кнігах, у газетных і часопісных публікацыях, так і ў галіне радыё і тэлежурналістыкі.

Я працаваў з табой на Беларускім радыё, пасля лёс звёў нас у рэдакцыі часопіса "Полымя", творча супрацоўнічалі мы і на тэлебачанні. Гэта былі гады шчырых гаворак, творчых спрэчак і нават дробных непаразуменняў -- словам, усяго таго, што здараецца пры звычайнай нармальнай творчай працы.

Сын вёскі, зямлі, ты з маладых гадоў спасціг рабочае рамяство і, як мала хто з нашага пісьменніцкага асяроддзя, ведаў жыццё будаўнікоў, заводчыкаў. Гэта дасканалае веданне было, мабыць, самым адметным у шматлікіх творах прозы і публіцыстыкі. Я неаднойчы быў сведкам, як шчыра і прыязна сустракалі цябе ў рабочым асяроддзі, дзе прымалі за свайго, а ты, у сваю чаргу, пачуваў там сябе не госцем.

Ты любіў бываць між людзей, шмат ездзіў, меў багата назіранняў, і гэта давала табе падставы цвёрда трымацца жыццём усталяванай думкі, пазіцыі. Можа, таму і на хутказменлівых вятрах ды каламутных калдобінах апошніх гадоў ты пачуваў сябе ўпэўнена і цвёрда трымаўся выбранага кірунку. Не кінуўся, як некаторыя, мітусліва і каньюнктурна шукаць цяплейшага прытулку, а як і раней, быў на скразняку, адкрыта казаў пра тое, што баліць, пра што думаў, выкладаў сваю праўду, уласнае меркаванне, не зважаючы на аўтарытэты і рангі.

Кожнаму з нас надзвычай цяжка цяпер пры халоднай няўвазе да чалавека творчай працы, які, як вядома, валодае вельмі чуйнай, далікатнай і крохкай душой, якую лёгка параніць.

Няшчадна лёс ламаў і цябе. Можа, больш жорстка, чым каго іншага. Спачатку забраў сына. У поўным росквіце маладых сіл. За непахісную пазіцыю, за публіцыстыку, што гучала па радыё, друкавалася ў газетах, дружна накінуліся, быццам гарластае вараннё, некаторыя з тых, хто прылюдна прапаведваў рознадум'е, а на самай справе загараўся лютай нянавісцю, чуючы думку, што не супадала з уласнай.

Ты быў па-добраму ўпарты і па вясковай, сялянскай звычцы за знявагу мог адвесіць важкую слоўную аплявуху. Твая дзёрзкая смеласць некаторых прыводзіла ў шаленства. Нават у суд валаклі, каб апраўдаць уласную цынічную несумленнасць.

Па прычыне хваробы ты не змог прысутнічаць на тым ганебным відовішчы, якое табе збіраліся наладзіць. А я пайшоў. Пайшоў з чыста чалавечай цікавасці, бо раптам зразумеў: адбываецца нешта такое, што пакінуць па-за ўвагай нельга. Гэта ж як даўно у нас, на роднай матухне-Беларусі, не судзілі пісьменніка за тое, што ён напісаў, за тое, што заступіўся за дзесяткі тысяч сумленных людзей, за тое, што сказаў сваё гнеўнае слова ў твар дзёгцемазу; у тым судовішчы, што табе рыхтавалі, я выразна адчуў павевы трыццатых і нават ранейшых гадоў, калі энкэвэдэшны хапун выкасіў столькі добрых імёнаў з пісьменніцкіх шэрагаў.

А суддзі хто?.. Яны з'явіліся дружна, амаль строем. Начале з нардэпам Навумчыкам і ісцом Лукашуком. Пры іх існавала свая прэса. Злая, абразлівая. Яна ў асобе некага Жданко пасля напіша /і гэта ў адзінай беларускамоўнай штодзённай газеце "Звязда"!/: "Нехта Валянцін Мыслівец... Які называе сябе пісьменнікам". І ўсё з ног на галаву!

Эх, хлопчыкі, колькі ў вас амбіцыі пры самай мізэрнай літамуніцыі!

Ды і наша родная "Літаратура і мастацтва" не засталася збоку.

Даруй, Валянцін Цімафеевіч, што перад апошняй тваёй дарогай давялося расказаць табе сумную гісторыю. Не ў ёй ты застанешся, а па праву ўвойдзеш у гісторыю роднай літаратуры. Але трэба, каб запомнілі імёны і тых, хто цябе травіў, хоць ёсць і Божы суд, як казаў паэт.

Я не згадаў бы пра той эпізод з апошніх дзён твайго нялёгкага жыцця, калі б...

...Калі б усё, што дзеелася з табой перад трагічным выпадкам, не пагражала б кожнаму з нас, жывых, хто, скажам, не застанецца раўнадушным да чарговага баевіка-дзёгцемаза.

...Калі б усім нам не пагражала раз'яднанасць, дзе вельмі зручна выбіваць па аднаму, бо ўсе астатнія безуважна назіраюць, як тое дзеецца не з імі.

...Калі б не бачыў, што гэтыя нахрапістыя хлопчыкі не спыняцца ў пошуках чарговых ахвяраў.

Тады яны не дачакаліся расправы над табой, але да сённяшняга дня цябе, мабыць што, наблізілі.

Ты не бачыў, колькі сабралася ля будынку правасуддзя тваіх чытачоў, якія прыйшлі засведчыць падтрымку табе, тваёй пазіцыі, тваёй творчасці.

А суддзі твае, ужо зніякавелыя ад гэтулькі народу, безвынікова вярталіся пад дакорлівымі паглядамі людзей ды ціха перамаўляліся. З іх гаманы адно выразна бразнула дробным медзяком моднае слоўка: "долар".

Што ж, у кожнага свае каштоўнасці. Той, хто на цябе падаў у суд, сёння стараецца дагадзіць у Мюнхене, на радыёстанцыі "Свабода". Такая ў іх любоў да кроўнага, роднага, да беларускага.

А ты, праўдашукальнік і бяссрэбранік, застаешся тут, на роднай зямлі, да апошняга дня захаваўшы ёй вернасць і адданасць, і яна будзе табе вечнай калыскай.

Генадзь ПАШКОЎ
29 чэрвеня 1993 г.

З НЯНАВІСЦЮ ДА САВЕЦКАГА ЛАДУ І ДА ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

(У сувязі з выхадам у свет "Беларускага гістарычнага часопіса". Мінск, 1993, N I, 128 с.).

Створаны ў студзені 1993 г. Мінскі гарадскі клуб гістарычных ведаў бачыць сваю асноўную задачу ў барацьбе за аб'ектыўнасць гістарычнай навукі, супраць фальсіфікацыі гісторыі чалавечага грамадства. У гэтай сувязі ў нас вельмі сур'ёзную трывогу выклікаў змест І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" за 1993 год, выхадам якога пакладзены пачатак функцыяніравання патрэбнага для навукі і грамадскасці выдання.

Калі найбольш лаканічна ахарактарызаваць галоўны напрамак І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса", то трэба адзначыць, што ён напісаны з пазіцый нянавісці да савецкага сацыялістычнага ладу, поўнага адмаўлення станоўчай ролі савецкай гістарычнай навукі, з пазіцый антысавецкай і нацыяналістычнай фальсіфікацыі гісторыі.

У нашым артыкуле не ставіцца задача ўсебаковага рэцэнзавання часопіса, бо для падрабязнага разгляду яго няправільных палажэнняў спатрэбілася б напісаць тэкст не намнога меншы за аб'ёмы цікавячага нас выдання. Таму ў сваім сціплым выступленні мы вымушаны выказаць толькі агульныя (часам тэзісна і канспектыўна) адносіны да заганных пазіцый гэтага часопіса.

Аўтары І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" нясуць калектыўную адказнасць за яго змест -- яны нават у сваіх тэкстах станоўча спасылаюцца адзін да аднаго. Таму, крытыкуючы асобныя палажэнні тэкстаў, мы не называем іх канкрэтных аўтараў. Аднак дзеля дакладнай арыентацыі чытачоў мы пасля паасобных крытычных заўваг будзем у дужках адзначаць адпаведныя старонкі часопіса.

Перш за ўсё спынімся на ачарніцельскіх і паклёпніцкіх выпадах супраць савецкага сацыялістычнага ладу. Аўтарам і ўсім стваральнікам І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" павінна быць вядома, як прагрэсіўныя прадстаўнікі грамадскіх навук ацэньваюць наша савецкае мінулае. Яны паказваюць дэфармацыі сацыялістычнага ладу, аналізуюць іх прычыны і характар, але...разам з тым прызнаюць, што пры ўсіх і ўсялякіх дэфармацыях у гады Савецкай улады ў нас было пабудавана сацыялістычнае грамадства. Аб гэтым сведчаць рэальныя гістарычныя факты: грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці, адсутнасць памешчыкаў і капіталістаў, эксплуатацыі і беспрацоўя, нябачаныя ў гісторыі (па тэмпах і маштабах) поспехі ў развіцці эканомікі, культуры, матэрыяльнага дабрабыту працоўных мас.

Насуперак усім гэтым гістарычным рэаліям стваральнікі "Беларускага гістарычнага часопіса" імкнуцца ўсю сямідзесяцігадовую гісторыю Савецкай улады (да адкрытага выступлення контррэвалюцыйных сіл) паказаць толькі ў адмоўных характарыстыках. Дзеля гэтага яны пачынаюць з паклёпу на У.І.Леніна, які быццам пайшоў нават на стварэнне БССР "выключна па кан'юнктурных меркаваннях" (с.21). Але ж чытачы могуць спытаць: а па якіх меркаваннях пад кіраўніцтвам ленінскай партыі былі створаны астатнія 14 саюзных рэспублік, дзесяткі аўтаномных рэспублік і абласцей? Дарэчы, усе яны ў адзіным Савецкім Саюзе жылі мірна і дружна не толькі без войнаў, але нават без сур'ёзных міжнацыянальных канфліктаў. На гэтай жа старонцы выказваюцца і адмоўныя адносіны да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

...А далей пайшло і пайшло. З многіх старонак "Беларускага гістарычнага часопіса" паліліся смуродныя памыі самых разнастайных антысавецкіх інсінуацый.

У часопісе адчуваецца выразнае імкненне скрыць ад чытачоў гістарычную прагрэсіўнасць сацыялістычнага ладу, сапраўдны дэмакратызм Савецкай улады як першай у свеце ўлады працоўных мас. Дзеля гэтага на многіх старонках часопіса, каб аглушыць і асляпіць чытача, выплюхваюцца цэлыя патокі такіх вызначэнняў як дыктатура партыі (21, 79), партакратыя (92), камуністычныя ўлады (17, 21, 92), таталітарны рэжым (17, 23, 102, 126), бальшавізм (15, 17), сацыялізм у бальшавіцкім разуменні (20). І гэтак далей і да таго падобнае. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік на старонках часопіса ператвараецца ў імперыю (11, 12, 17, 18, 21, 22, 93), у якой нібыта БССР не мела дзяржаўнага суверэнітэту (17, 21, 95).

Але ж тады існавала асаблівая форма суверэнітэту рэспублік у саюзнай аб'яднанай дзяржаве. І калі Беларуская ССР дзялілася часткай свайго суверэнітэту з агульнасаюзнымі дзяржаўнымі органамі, то яна мела ад іх ніколі не бачаную, каласальную падтрымку і дапамогу. Пры тым, унутрысаюзным суверэнітэце тэмпы развіцця народнай гаспадаркі Беларусі былі намнога вышэйшымі за сярэднія тэмпы ў цэлым па СССР. Беларусь пры ўнутрысаюзным суверэнітэце атрымала 35 вышэйшых навучальных устаноў.

На старонках І-га нумара часопіса распавядаецца старая нацыяналістычная байка пра тое, быццам расейскія бальшавікі не вярнулі Беларусі ўсе яе этнаграфічныя землі (21). Але ж у беларускай гістарычнай навуцы ўжо даўно паказана, што паміж кожнымі дзвума братнімі ўсходнеславянскімі народамі існуе шырокая пераходная паласа гаворак, аднолькава блізкіх да асноўных моўных масіваў гэтых суседніх народаў. І толькі нацыяналісты аб'яўляюць усю такую пераходную паласу належачай выключна да адной сваёй дзяржавы.

У часопісе адмоўна характарызуецца знешняя палітыка Савецкага Саюза (105-107 і інш.) і пры гэтым робіцца папрок, што "да апошняга часу ў СССР была самая буйная армія ў свеце" (92). Але ж савецкі народ стварыў магутнейшую дзяржаву, якая выратавала ўсё чалавецтва ад гітлераўска-фашысцкіх агрэсіўных дзеянняў, дала магчымасць нашым людзям займацца мірнай стваральнай працай. Пры гэтым Савецкі Саюз сваёй знешняй палітыкай не зрабіў шкоды прагрэсіўным сілам ні ў адной краіне.

Калі чытаеш у "Беларускім гістарычным часопісе" ачарніцельскія інсінуацыі ў адрас Сацыялістычнай Бацькаўшчыны, міжволі ўзнікае думка аб аўтарах гэтых інсінуацый. Хто яны, дзе яны атрымалі вышэйшую адукацыю, высокія вучоныя ступені і званні: у Сарбоне, Оксфардзе, Кембрыджы? Іх жа ўскарміла, выхавала, адукавала Савецкая радзіма. І вось цяпер, седзячы перад каляровымі тэлевізарамі ва ўтульных дзяржаўных кватэрах, апранутыя ў адмысловае адзенне, яны клянуць на чым свет стаіць Кастрычніцкую рэвалюцыю, Леніна, сацыялістычны лад.

Калі ўжо гэтыя пярэваратні канчаткова страцілі высакароднае пачуццё ўдзячнасці сваёй Радзіме, то зусім лагічна было б бачыць, каб яны, адрасуючы праклёны ўсякаму савецкаму ладу жыцця, зноў абуліся ў дарэвалюцыйныя лапці, згрэбнае адзенне, вярнуліся ў хаціны з земляной падлогай і сляпымі ваконцамі.

Але ім не падабаецца нават тая савецкая гістарычная навука, якую яны самі выбралі, якую лічылі сваёй жыццёвай прафесіяй. Учарашнія дагматыкі і апалагеты сёння, змяніўшы сваю афарбоўку, сталі на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса" выступаць супраць "адзінай партыйна-дзяржаўнай метадалогіі" (5, 8, 11, 12, 21, 23), супраць "манаполіі цэнтра" (4) і "догмаў бальшавізму" (15), супраць класавага падыходу ў даследаванні гістарычнага працэсу (13, 17, 21, 103) і, падводзячы вынікі сваіх абвінавачванняў, безапеляцыйна заявілі, быццам уся савецкая гістарычная навука тэндэнцыйна займалася фальсіфікацыяй падзей далёкага і блізкага мінулага (18, 21, 24 і інш.).

Вядома, што разглядаючы складаны і супярэчлівы шлях савецкай гісторыяграфіі, аб'ектыўныя і сумленныя даследчыкі адзначаюць цэлы шэраг недахопаў савецкай гістарычнай навукі. Разам з тым было б архінесправядліва адмаўляць выдатныя дасягненні савецкіх гісторыкаў і іншых прадстаўнікоў нашых грамадскіх навук.

Кіруючыся матэрыялістычнай дыялектыкай, знаходзячыся на пазіцыях матэрыялістычнага разумення гісторыі, даючы класавы аналіз падзей мінулага, ацэньваючы падзеі з пункту гледжання іх прагрэсіўнага або рэакцыйнага характару, савецкая гісторыяграфія ўпершыню стварыла стройную, сапраўды навуковую агульную канцэпцыю гістарычнага працэсу. У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй уся гісторыя чалавецтва развіваецца ад ніжэйшых да вышэйшых форм арганізацыі грамадства ў выглядзе змены сацыяльна-эканамічных фармацый. Змены гэтыя адбываюцца шляхам сацыяльных рэвалюцый, а пастульны рух чалавецтва пераадольвае на сваім шляху рэакцыйныя контррэформы і контррэвалюцыйную рэстаўрацыю старых, аджыўшых форм грамадскага ладу.

Такая канцэпцыя гістарычнага працэсу прызнаецца цяпер усёй прагрэсіўнай грамадскасцю свету. Аднак аўтары "Беларускага гістарычнага часопіса" не толькі рашуча выступілі супраць гэтай канцэпцыі, але сталі на шлях суцэльнага абвінавачвання савецкай гістарычнай навукі.

Што ж замест гэтага даюць чытачам аўтары і рэдактары "Беларускага гістарычнага часопіса"? Яны адкрыта і рашуча сталі на шлях уласнай фальсіфікацыі гісторыі, не спыняючыся нават перад прамым перакручваннем фактаў. Прычым у іх уласная фальсіфікацыя часта ідзе поруч з абвінавачваннем савецкай гістарычнай навукі. У многіх выпадках фальсіфікацыя на старонках часопіса носіць нацыяналістычную афарбоўку. Мы ў сваім артыкуле разгледзем толькі некаторыя, важнейшыя прыклады гэтай фальсіфікацыі, бо крытыку фантастычнай колькасці фальсіфікатарскіх імправізацый проста немагчыма даць на старонках аднаго артыкула. Для зручнасці будзем разглядаць гістарычныя падзеі ў іх храналагічнай паслядоўнасці.

Аднак перш мы вымушаны спыніцца на некаторых агульнагістарычных пазіцыях аўтараў часопіса, звязаных з іх заганнымі адносінамі да канкрэтных падзей мінуўшчыны. У часопісе падкрэсліваецца неабходнасць кіравацца "нацыянальнай канцэпцыяй гісторыі Беларусі" (15, 17, 21) і нават робіцца заклік да "сапраўднай беларускай разважлівасці" (8). Але ж якая можа быць агульнанацыянальная канцэпцыя, калі нават у мінулым вучоныя стаялі на розных класавых пазіцыях, абараняючы інтарэсы феадалаў або прыгонных сялян, буржуазіі, або пралетарыяў. А калі гаварыць аб "беларускай разважлівасці", то ўзнікае пытанне: а ці ёсць такая разважлівасць у рускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх гісторыкаў?

Гістарычная канцэпцыя можа быць толькі навуковай ці антынавуковай. Іншая справа, што кожны народ (у тым ліку і беларускі) павінен быць зацікаўлены ў як мага больш шырокім і грунтоўным асвятленні сваёй гісторыі. Але ж гэта аспект зусім не канцэптуальнага характару.

Стваральнікі І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" настойліва рэкамендуюць чытачам карыстацца працамі гісторыкаў В.Ластоўскага, А.Цвікевіча, А.Станкевіча, У.Ігнатоўскага. Пры гэтым нічога не гаворыцца аб іх нацыяналістычных памылках, якія, дарэчы, зрабілі свой адмоўны ўплыў і на змест І-га нумара цікавячага нас часопіса.

Разглядаючы канкрэтныя імправізацыі аўтараў "Беларускага гістарычнага часопіса" ў храналагічным парадку, звернемся перш за ўсё да праблемы, якая названа: "Паходжанне беларускага этнасу". Вядома, што ў савецкай гістарычнай навуцы існуе погляд, паводле якога тры ўсходнеславянскія народнасці (вялікаруская, беларуская, украінская) сфарміраваліся на аснове адзінай старажытнарускай народнасці пасля распаду адзінай Старажытнарускай Кіеўскай дзяржавы. Сучасныя нацыяналістычныя фальсіфікатары гісторыі ўсялякімі спосабамі імкнуцца абвергнуць гэта палажэнне. Найбольш абачлівыя сярод іх проста не ўспамінаюць пра Старажытную дзяржаву.

Але вось у І-м нумары "Беларускага гістарычнага часопіса" прыводзіцца зусім новы, ашаламляльны "довад". Там катэгарычна і адназначна адмаўляецца нават існаванне гэтай дзяржавы і сцвярджаецца быццам яе наогул прыдумалі савецкія гісторыкі (18, 19). Абвінавачваючы савецкую гістарычную навуку, аўтар часопіса яшчэ вядзе гульню вакол слова "цэнтралізаваная". Але ж савецкія гісторыкі не менш за іх крытыка ведалі вызначэнне К.Маркса аб тым, што імперыя Рурыкавічаў была "шматковай". Дарэчы ў іншым месцы (32) гаворыцца, што такая "адзіная дзяржава" усё ж існавала.

Аднак галоўнае ва ўсёй гэтай праблеме заключаецца ў іншым. Пры ўтварэнні феадальных дзяржаў наогул адбываецца барацьба паміж дзвюма тэндэнцыямі: цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі. У Старажытнарускай дзяржаве сілы дэцэнтралізацыі вельмі адмоўна дзейнічалі на абарону супраць нападаў печанегаў, полаўцаў і іншых знешніх варожых сіл. Вось чаму імкненне Полацкага княства да абасобленасці іграла тады негатыўную ролю. А нашы сучасныя імправізатары, якім хачацца зрабіць Полацкае княства яшчэ ў складзе Кіеўскай Русі першай старажытнай беларускай дзяржавай, не жадаюць лічыцца з тым, што нават у часы Усяслава Чарадзея Сафійскі сабор у Полацку не мог быць пабудаваны без высокага ўзроўню архітэктурна-будаўнічага майстэрства адзінай магутнай Старажытнарускай дзяржавы.

У часопісе праводзіцца проста бязмежная ідэалізацыя Вялікага Княства Літоўскага і адначасова ачарненне Маскоўскага княства. Нічога не гаворыцца аб заходніцкіх войнах ВКЛ (19, 20). На старонках часопіса не раскрываецца галоўная, вызначальная гістарычная тэндэнцыя таго часу: пасля Крэўскай уніі (1385 г.) у ВКЛ сістэматычна ўзмацняецца ўплыў каталіцызму, агрэсіўнае наступленне якога вялося з суседняй Польшчы. У сувязі з такімі пазіцыямі часопіса ў ім не ставіцца задача паказваць барацьбу беларускага насельніцтва супраць акаталічаных феадалаў, якія атрымлівалі асаблівыя прывілеі.

Адкрытая русафобія прывяла "Беларускі гістарычны часопіс" да фальсіфікацыі беларуска-польскіх адносін у Рэчы Паспалітай. Дайшло да таго, што часопіс стаў на пазіцыі адмаўлення нацыянальна-вызваленчай барацьбы ўкраінскага народа супраць Рэчы Паспалітай 1648-1654 гг., у якой прымалі ўдзел і прыгнечаныя беларусы. Гэтую барацьбу часопіс падмяніў антыфеадальнай вайной 1648-51 гг. (83), нават нічога не сказаўшы, што гэта нацыянальна-вызваленчая барацьба завяршылася не ў 1651, а ў 1654 г. уступленнем Украіны ў састаў Расіі. Прапануючы да ведама чытачоў асноўныя праблемы гісторыі Беларусі, часопіс нават не выдзеліў праблему знаходжання яе ў складзе Рэчы Паспалітай (19-20).

Перыяд гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі запэцканы такім тоўстым слоем каламазі (16, 19-21 і інш.), што ў тэксце часопіса нельга знайсці нават аніводнага светлага месца. Упарта прытрымліваючыся антынавуковых пазіцый, аўтары і астатнія ўдзельнікі падрыхтоўкі І-га нумара ў даным выпадку яшчэ больш рашуча ігнаравалі асноўную, вызначальную тэндэнцыю гістарычнага працэсу.

Яе галоўная сутнасць заключаецца ў тым, што ў агульнай дзяржаве з самым блізкім у этнічных адносінах рускім народам беларусам не пагражала такая дэнацыяналізацыя, як гэта адбывалася ў Рэчы Паспалітай. Становішча беларусаў у Расіі было звязана не толькі з самавольствам Мікалая Палкіна і Бенкендорфа, Мураўёва-вешальніка і Пабеданосцава, Пурышкевіча і Распуціна, не толькі з дэспатызмам і русіфікацыяй. Апрача гэтага была яшчэ Расія дзекабрыстаў і Герцана, Чарнышэўскага і Дабралюбава, рэвалюцыйных рабочых і сялян, бальшавікоў і Леніна.

Ніякім чынам нельга ігнараваць той акалічнасці, што блізкасць беларускай і рускай моў, адсутнасць глухога моўнага бар'еру давалі магчымасць многім беларусам атрымліваць не толькі сярэднюю, але і вышэйшую адукацыю. Многія беларусы сталі тады выдатнымі вучонымі і пісьменнікамі, афіцэрамі і генераламі, чыноўнікамі і грамадскімі дзеячамі. У такіх умовах стала магчымым беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне пачатку XX

стагоддзя. Працоўныя Беларусі ўключыліся ў агульнарасійскую рэвалюцыйную барацьбу супраць цара, памешчыкаў і буржуазіі, што прывяло беларускі народ да сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

У І-м нумары "Беларускага гістарычнага часопіса" выказваюцца адмоўныя адносіны да ўтварэння БССР (21) і падрабязна прапагандуецца ідэя так званай Беларускай народнай рэспублікі ў сувязі з яе 75-годдзем (62-72). Дыскутаваць з прыхільнікамі гэтых пазіцый няма ніякай карысці. У падрыхтаваным мінскім гарадскім клубам гістарычных ведаў (падпісаным 43 дзеячамі навукі і культуры) артыкуле "25 сакавіка: чыё гэта свята?" (гл."Мінская праўда" 6 сакавіка 1993г., "Звязда" 11 сакавіка, "Народная газета" 12 сакавіка, "Во славу Родины" 23 сакавіка 1993 г.) самым шырокім колам грамадскасці было паказана, што "юбілей БНР -- гэта свята прыхільнікаў і апалагетаў капіталізму".

Аб зласлівым паклёпе на савецкі сацыялістычны лад, які выпірае са старонак "Беларускага гістарычнага часопіса", гаварылася ў пачатку нашага артыкула. Тут мы прывядзем яшчэ некаторыя прыклады. На стар. 13, 15, 17 распаўсюджваецца вымысел, быццам Беларусь у СССР была чыімсьці васалам, знаходзілася ў прыгнечаным каланіяльным становішчы, быццам у СССР наогул "адмаўлялася існаванне нацыянальных культур".

Зусім відавочна, што няма аніякага сэнсу такое паклёпніцтва ператвараць у прадмет дыскусіі.Калі браць пад сур'ёзную ўвагу гэтакія паклёпы, то стане зусім незразумелым, чаму Беларусь пры Савец-



кай уладзе стала краінай з абавязковай сярэдняй адукацыяй, са сваёй Акадэміяй Навук, з вядомай ва ўсім свеце мастацкай літаратурай, нават з чэмпіёнамі спорту міжнароднага класа.

Унеслі свой уклад аўтары часопіса і ў моднае цяпер раздуванне маштабаў рэпрэсій (80 і інш.), зусім адмовіўшыся ад таго, што апрача неабгрунтаваных рэпрэсій былі яшчэ і рэпрэсіі заканамерныя супраць тых, хто выступаў за насільнае звяржэнне савецкага ладу. У сваіх антыгістарычных захапленнях аўтары дайшлі да таго, што заявілі: "Пачатак сталінскага тэрору звязаны з грамадзянскай вайной" (79). Але ж І.В.Сталін тады не з'яўляўся яшчэ нават Генеральным сакратаром ЦК бальшавіцкай партыі, а неабгрунтаваныя рэпрэсіі таго перыяду былі звязаны ў першую чаргу з дзейнасцю Троцкага, Зіноўева, Свярдлова.

Фальсіфікатары з "Беларускага гістарычнага часопіса" не абмінулі сваімі скажэннямі і падзей часоў другой сусветнай вайны. Яны сталі на пазіцыі адмаўлення вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. на тэрыторыю Заходняй Беларусі (106), узвялі паклёп аб тым, быццам тады Заходняя Беларусь трапіла пад савецкі прыгнёт (107). Але ж сярод аўтараў і адказных за выпуск І-га нумара часопіса можна сустрэць яшчэ і такіх, якія самі (не гаворачы ўжо пра іх бацькоў) "за польскім часам" насілі згрэбныя кашулі, шарачковыя даматканыя парткі і бегалі да суседзяў пазычаць вугалёк, каб распаліць агонь у сваёй печы.

Як жа можна гэтым былым юнакам, паспытаўшым гаротнага жыцця і стаўшым цяпер вучонымі, праяўляць такую чорную няўдзячнасць да сваёй сацыялістычнай Радзімы?!

Самая беспардонная фальсіфікацыя назіраецца ў часопісе і пры характарыстыцы гісторыі СССР 80-х гадоў (92). Тут зусім не паказана, што з сярэдзіны гэтых гадоў у Савецкім Саюзе пачала арудаваць групоўка гарбачоўскіх антысацыялістычных дыверсантаў. Іх разбуральную дзейнасць аўтары часопіса перанеслі і на першую палову 80-х гадоў, калі, нягледзячы на ўсе недахопы, існавала магутная дзяржава, а сучасныя фальсіфікатары гісторыі карысталіся амаль бясплатнымі кватэрамі і маглі для сваіх дзяцей за нізкую плату выбраць любыя цукеркі, якія ім былі найбольш да спадобы.

На старонках 93, 95, 96 І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" прапеты дыфірамбы сучаснай "незалежнасці" Рэспублікі Беларусь з адначасовай абмазкай дзёгцем таго, што было раней. Але ж, хто хоча, той зразумее, што з распадам Савецкага Саюза Беларусь страціла сваю фактычную незалежнасць. Яна цяпер эканамічна залежыць не толькі ад рэспублік СНД, але і ад дзяржаў капіталістычнага свету. Паўтараючы байку аб бяз'ядзерным статусе Беларусі, аўтары часопіса зводзяць у зман сваіх чытачоў. Тым жа, хто бачыць абсурднасць у аб'яўленні бяз'ядзернага статуса невялікіх рэгіёнаў, добра зразумела, што для знішчэння Беларусі ў сучаснай вайне дастаткова скінуць тры вадародныя бомбы на прылягаючых тэрыторыях суседніх дзяржаў: Расіі, Украіны, Польшчы.

* * *

Так выглядаюць несумленныя імправізацыі ўдзельнікаў падрыхтоўкі І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса". Яны зрабілі не толькі вялікую шкоду гістарычнай навуцы, але адыгралі сваю ролю ў скажэнні гістарычнай памяці народа.

У заключэнні лічым неабходным паведаміць наступнае. Калі ў дачыненні да І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" мы ўстрымаліся ад упамінання прозвішчаў тых, хто вінаваты ў фальсіфікацыі гісторыі, то ў далейшым гэтага не будзе. Калі раней лічылі, што краіна павінна ведаць сваіх герояў, то наш працавіты і гераічны народ павінен таксама ведаць сваіх адшчапенцаў, пярэваратняў і фальсіфікатараў гісторыі.

Мінскі гарадскі клуб гістарычных ведаў для таго і існуе, каб не засталіся неўзаважанымі найбольш шкодныя і небяспечныя выпадкі фальсіфікацыі гісторыі.

Артыкул адобраны пасля абмеркавання І-га нумара "Беларускага гістарычнага часопіса" на агульным сходзе Мінскага гарадскога клуба гістарычных ведаў 24 мая 1993 г.

Па даручэнні сходу падпісалі члены клуба:

П.С.ГЕРАСІМОВІЧ, настаўнік гісторыі.
М.Г.ЖАРКОЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.
Д.П.ЖМУРОЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза.
А.І.ЖУРАЎСКІ, член-карэспандэнт АН РБ, доктар філалагічных навук, прафесар.
А.І.ЗАЛЕСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар.
В.А.ВАЙЦЯХОЎСКІ, доктар эканамічных навук, прафесар.
А.П.КАПЫЛОЎ, ваенны гісторык, генерал-маёр, у адстаўцы.
Я.В.ПРЫМЕРАЎ, доктар гістарычных навук, прафесар.
А.А.ФІЛІМОНАЎ, доктар гістарычных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза.



ГРАЖДАНСКИЕ РИТМЫ

Александр ЕГОРОВ

МОСКОВСКАЯ НОВЬ

В московских магазинах
Уже не толчея.
Но с кислой ходит миной,
С порожнею корзиной
Вдоль них Москва моя.
Зато на тротуарах
Торгуются -- ой-ой!
И малый да и старый,
Слепец, певец с гитарой,
Полковник отставной.
Распрыгались, как блохи,
Толкаются, снуют.
Здесь отбирают крохи
С таким притворным вздохом...
И в душу вам плюют!
Старушка-одуванчик
С плакатиком дрожит:
"Болеет внучек-мальчик.
Подайте! Как нам жить?"
Но посмотрите, люди!
Какой великий миг!
Как бог -- красив и чуден --
Явился биржевик.
И взглядом беззаботным
Все мигом осмотрел.
Коньяк, вино и шпроты
Загреб в баул, пострел!
И бросив денег пачку,
Смеясь в машину влез:
"Себе оставьте сдачу."
Задал он нам задачу:
Не в этом ли прогресс?
Живем мы, будто в сказке.
Успех! Какой успех!
Как гениально встряска
Устроена для всех.

Александр СЕРДЮКОВ

ВСТРЕЧА С ПУШКИНЫМ

На опушке у лесной избушки
Повстречался мне спешивший
Пушкин --
Молодой, улыбчивый, кудрявый,
Бог-поэт всесветно яркой славы:
Длинная накидка на плечах,
Радость лучезарная в очах,
Шляпа за спиною на шнурке,
Книга в полусогнутой руке.
Шаг широкий: видно, торопился.
Все лицо светилося -- влюбился!
Я решил: шагает к Анне Керн.
Зеленели ландыши в руке:
Свежие -- блестели в них росинки,
Солнечно-прозрачные бусинки...
Пораженный обликом поэта,
Я застыл в ознобе жарким летом.
-- Что стоишь? -- позвал хозяин
дома. --
Ведро же -- ни молнии, ни грома.
(А лицо с чего-то побелело).
В дом иди, вдали стоять не дело.
А, дошло: впервые видишь это --
Новое явление поэта...
От избушки шел ко мне приятель,
Лесовик, по дереву ваятель.
-- Бог ты мой! -- Я тронут был
душевно. --
Да твое творенье -- совершенно!
-- Помолчи, -- прервал меня лесник,
Посуровел, с виду будто сник. --
Знаешь ведь -- я с Пушкиным живу,
С ним и в мыслях, словно наяву.

Михаил ЧЕПРАСОВ

ЗАБОРЫ И КАНАВЫ
(басня)

По просеке лесной гуляли два Ежа --
Заезжий Гость и местный житель.
-- А ну, любезный, покажи-ка
Твоих владений где межа?
Еж тутошний вопросу удивился.
Разинув рот, у пня остановился.
-- Помилуй, дед и мой отец
Ни разу мне не говорили,
Где есть начало и конец
Бугра, на коем дружно жили.
-- То было раньше, а теперь,
Ты мне, пожалуйста, поверь,
Нужны везде заборы и канавы,
Чтоб каждый самый малый зверь
Стал обладателем своей дер-жа-вы!
Уехал Гость, а местный Еж
С тех пор живет в большой тревоге:
А вдруг ограды возведешь
И сам же поломаешь ноги?

Аляксей КУЗНЯЦОЎ

ОДА "ДЭМАКРАТАМ"
(Старая песня на сённяшні лад).

Хвала "дэмакратам" навекі ў вякі,
За тое, што ў гандаль гуляюць!
Праславім іх локці, іх спрыт і клыкі,
Што храбра партфелі хапаюць!
Усе цэны ўверх рвуцца,
рэформы трашчаць,
А зыдні машну набіваюць,
Парламент грыміць, дэпутаты
вішчаць, --
У рынычны "рай" нас гукаюць.
Спяваюць пра біржы нам гімны жрацы,
Купонаўскі блін выхваляюць.
І мчаць за мяжу купцы-малайцы,
Там ЗІЛы на мыла мяняюць.
Мяняюць руду і наш лес на трусы,
Алмаз -- на анучы, заклёпку.
А іх падпявалы, навукі тузы,
Ім "дзякуй"! Пяюць за пахлёбку.
Ура таўстасумам! Віват ім, -- вянкі
За тое, што нас абдзіраюць!
Пахвалім іх рылы, званы-языкі,
Што ў лапці народ абуваюць.
Раскусім мы іх барыкадны галдзёж --
Пра "подзвіг" базарныя казкі,
Ілжэпатрыётаўскі іх спекулёж,
Далоў іх "геройскія" маскі!
Асудзім паклёпы нячыстай шпаны,
Што Армію нашу шальмуе,
Салдат, афіцэраў свяшчэнныя вайны
Маральным тэрорам мардуе.
"Прарабы" з аркестрам свайго
байструка
Аўралам учора віталі,
А сёння, як злыя каты пацука --
Пад хвост перабуд пахавалі.
Не скажуць банкроты ніколі аб тым,
Дзе слаўны пачын свой зарылі,
Куды іх прывёў "перастроечскі" дым --
Смурод ў кампанейскім кадзіле?!

Міхась БАШЛАКОЎ

ЗВАНІЦЕ, ЗВАНЫ...
(Уравак)

...Як гэта магчыма --
Жабрачка Айчына?
Званіце, званіце,
Званіце, званы!
Мой любы народзе,
Цярпець, можа, годзе
Рабом быць да скону?
Бы ў дзікім палоне,
Радзіма сягоння...
Капыцяць нас коні,
Шалёныя коні --
Бяссільных, знямоглых --
Па душах, па душах,
Нібы па быльнёгу...
Ці ёсць што святое?
Чаму ж ты, гаспадзь,
Дазваляеш такое?!
Але і трава
Зноўку цягнецца к сонцу,
Тым болей народ --
Немагчыма бясконца
Таптаць людзям душы!
У праведным гневе
Ён выйдзе, Ён рушыць
З лясоў партызанскіх,
З палескіх балот
Мой ціхі,
Цярплівы
І мужны народ.
Усё ён прыпомніць:
І боль, і пакуты,
І горкі Чарнобыль,
І здзек над сабою.
Ён шле вам праклёны,
Народ мой і біты,
Народ мой і гнуты.
Яшчэ па акопах,
Зарослых травою,
Ржавеюць патроны
Мінулай вайны...
Званіце, званіце,
Званіце, званы!

Николай БАТЧЕНКО

ДВУЛИКИЙ

До перестройки тихо жил,
Как крот в норе глубокой.
Лишь о карьере он тужил --
Заманчивой, далекой.
Учел возможности сейчас:
Свобода мнений, гласность...
Пришел его желанный Час --
И "кто есть кто?" внес ясность.
Забросил кафедру, а с ней
И все свои науки.
В политике, в борьбе идей
Решил "погреть" он руки.
Теперь его терзает страсть
И не дает покоя:
Любым путем пролезть во власть --
Стремление такое.
Он за народ "стоит стеной" --
Уловка своего рода.
И ставит он вопрос любой
От "имени народа".
Ему однако ж невдомек,
Что в ряде мест нет хлеба,
Что от народа он далек, --
Как от Земли до неба.
Считался доктором наук
У нас, в стране великой,
Но очернил все наше вдруг,
Став личностью двуликой.

СЛАВЯНСКИЙ МИР

Митрополит ИОАНН:
" Я НЕ ПОЛИТИК, Я - ПАСТЫРЬ"

Ответы митрополита Санкт-Петербургского и Ладожского Иоанна на вопросы газеты «Московские новости», на которых она настаивала, но не решилась напечатать.

В конце мая к владыке Иоанну с просьбой ответить на некоторые вопросы обратились «Московские новости». Владыка дал согласие, и из редакции пришел факс, содержащий тексты вопросов, на которые редакция желала получить ответы митрополита. Ответы просили передать заведующему отделом морали и права Владимиру Шевелеву.

Несколько раз сотрудники редакции звонили в резиденцию митрополита, настаивая на скорейшей присылке ответов. И вот текст ответов передан из рук в руки господину Шевелеву, который заверил, что интервью будет опубликовано в ближайших номерах. Однако присланный пресс-службой митрополита текст редакции очень не нравится. Особенно там, где речь идет о скандально известных «Протоколах сионских мудрецов»... Короче — публикация не состоялась.

Вопрос: В своей книге о церковных расколах в русской церкви вы пишете, что самое тяжелое для церкви — это раскол. На сегодняшний день вы своим авторитетом и жесткой позицией волей или неволей становитесь духовным вождем нового намечающегося раскола. Часть приходов вашей епархии не поминает вас, часть — патриарха. Тревожит ли вас создавшееся положение?

Ответ: Меня в первую очередь тревожит тот очевидный факт, что в последнее время некоторыми средствами массовой информации приложено немало усилий, чтобы навязать русской церкви раскол, для которого в действительности нет никаких оснований. Кому-то очень не нравится, что, несмотря на сложнейшую обстановку в стране, церковь продолжает в подавляющей своей части оставаться единым духовным организмом.

Я никогда не являлся, не являюсь и не буду являться «духовным вождем намечающегося раскола». Церковные расколы, по сути самого этого явления, могут происходить только по вопросам, имеющим каноническое или догматическое значение. И только тогда, когда эти вопросы приобретают для внутрицерковной благодатной жизни принципиальный, решающий характер. Возможен, правда, еще один вариант — раскол как следствие мощного давления государственной, светской власти, но хотелось бы верить, что сегодня он неактуален.

Так вот — жизнь русской церкви, как и всего народа, изобилует ныне проблемами, сложностями и нестроениями, но ни одно из этих явлений не содержит само по себе оснований для раскола. Более того, если нам не будут мешать, если в жизнь церкви не будут вмешиваться амбициозные политики и некомпетентные журналисты, религиозная жизнь России нормализуется естественным путем, причем довольно быстро.

Что касается «непоминающих» приходов, могу вам сказать — возношение имен правящего архиерея и патриарха совершается в Санкт-Петербурге в полном соответствии с канонической и дисциплинарной практикой церкви. Просто кому-то очень хочется выдать желаемое за действительное.

Вопрос: В середине 70-х годов в отчете заместителя председателя совета по делам религии В.Фурова перед политбюро вы попали в третий разряд русского епископата как «неблагонадежный». Чем можно объяснить, что сегодня вас широко публикует газета коммунистов «Советская Россия»?

